УДК 911 (476.5)
502.64(476)

М.В. Півавар

# Гісторыка-культурная і прыродная спадчына ў наваколлях Віцебска

Важнасць захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны ні ў каго не выклікае сумненняў. На працягу XX стагоддзя гісторыка-культурная і прыродная спадчына Беларусі вельмі пацярпела. Войны, «ваяўнічы атэізм», ідэалагічная ўстаноўка КПСС на барацьбу з «класава-варожымі» элементамі не пашкадавалі помнікаў ні матэрыяльнай, ні духоўнай культуры. Тыя, што захаваліся, былі занесены ў рэспубліканскі «Збор помнікаў гісторыі і культуры»,. Але ён быў заідэялагізаваны, вялікае месца адводзілася помнікам Вялікай Айчыннай вайны, рэвалюцыйных падзей і сацыялістычнага будаўніцтва. У той жа час амаль адсутнічалі звесткі пра помнікі культавай архітэктуры, сядзібы і ўвогуле помнікі дарэвалюцыйнага часу. Не ўсе былі ўзяты на ўлік помнікі археалогіі. Падобную сітуацыю можна было назіраць і з помнікамі прыроды. Пад ахову былі ўзяты далёка не ўсе вартыя апекі аб'екты, а ў амаль адзіным выданні на гэтую тэму «Помнікі прыроды Беларусі» ўтрымліваліся толькі агульныя звесткі пра іх.

Са зменамі, якія адбываюцца ў нашым грамадстве на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, сітуацыя з аховай помнікаў гісторыі і культуры палепшылася, але застаецца складанай. Прымаюцца адпаведныя пастановы ўрада, мяняюцца адносіны грамадства да сваёй спадчыны. Камітэт па ахове помнікаў гісторыі і культуры быў рэарганізаваны ў дэпартамент міністэрства культуры. Складаецца новы спіс помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Але, як паказвае практыка, яшчэ і зараз застаецца шмат помнікаў, якія не былі ўключаны ў стары спіс па шэрагу прычын (ідэалагічныя матывы, адсутнасць звестак), і не трапляюць ў новы спіс. Адсюль вынікае актуальнасць данага даследавання: увесці ў навуковы абарот звесткі пра аб'екты, якія маюць вялікую гісторыка-культурную, прыродную каштоўнасць, садзейнічаць іх рэгістрацыі ў якасці помнікаў прыроды, гісторыі і культуры, вызначыць ролю работы па выяўленню ахоўваемых аб'ектаў у выхаванні моладзі.

На наш погляд, пытанні пошуку, выяўлення, мерапрыемствы па рэгістрацыі помнікаў гісторыі, культуры і прыроды, не знайшлі дастатковага асвятлення ў друку. Маючыяся на гэтую тэму выданні [1, 2] утрымліваюць толькі агульныя звесткі пра існуючыя зарэгістраваныя помнікі. У часопісах «Родная прырода», «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (з 1989 г. «Спадчына») перыядычна з'яўляліся артыкулы пра новыя помнікі прыроды і культуры. Некаторыя звесткі можна адшукаць у выданнях мясцовых краязнаўцаў [3-9]. У працы [10] абагульнены досвед працы па пошуку помнікаў прыроды. Некаторыя звесткі можна адшукаць у перыядычным друку [11-12]. Агляд літаратуры паказвае нераспрацаванасць дадзенага пытання. Для атрымання новых звестак трэба праводзіць сістэматычную працу на мясцовасці ў выглядзе паходаў,

экспедыцый па пошуку і выяўленню аб'ектаў гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны.

На працягу 1996-2002 гадоў турысцка-эколага-краязнаўчым клубам «Дзвіна» Лужаснянскай гімназіі праводзіліся паходы, экспедыцыі, вандроўкі ў наваколлях Віцебска. У выніку іх выяўлены шэраг невядомых раней аб'ектаў, якія могут быць зарэгістраваны як помнікі гісторыі, культуры і прыроды. У час экспедыцый вучнямі праводзіўся агляд, выяўленне стану ўжо зарэгістраваных, а таксама пошукі яшчэ не вызначаных помнікаў гісторыі, культуры і прыроды. На працягу паходаў вялося апісанне, фатаграфаванне, ацэнка стану аб'ектаў. Перад прадстаўленнем падрыхтаваных матэрыялаў у інспекцыю па ахове навакольнага асяроддзя праводзіліся кансультацыі са спецыялістамі кафедраў гісторыі Беларусі, батанікі, геаграфіі ВДУ ім. П.М. Машэрава, інстытута гісторыі НАН РБ, Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага лясгаса, Белгідрахоза, Белгіпразема. На аснове матэрыялаў рабіліся артыкулы ў мясцовым друку і сюжэты для мясцовага тэлебачання. З мэтай наведавання выяўленых і вядомых аб'ектаў распрацаваны турысцка-краязнаўчыя і турысцка-экапагічныя маршруты, выдадзены буклеты, падрыхтавана перасоўная выстава, існуе сайт у Інтэрнэце, які ўтрымлівае больш за 1000 фотаздымкаў, 37 мегабайт інфармацыі. Для распрацоўкі маршрутаў выкарыстоўвапася карта [14]. Звесткі сістэматызуюцца, зроблена і папаўняецца картатэка фотаздымкаў пра наваколлі Віцебска па раздзелах: помнікі гісторыі і культуры, помнікі прыроды, рэкі і азёры, краявіды, кветкі Прыдзвіння і іншыя. Атрыманы ад праведзенай дзейнасці па выяўленню помнікаў прыроды досвед быў абагульнены і выдадзены асобным выданнем [8].

**Аб'екты ў наваколлях Віцебска,**
**якія могут быць зарэгістраваны як помнікі гісторыі і культуры:**

1. **Курган і каменныя крыжы** каля в. Сушчова Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Знаходзіцца ў 3 км на паўночны захад ад вёскі і 1 км на ўсход ад акружной шашы Віцебск-Гарадок, на правым беразе ракі Лужаснянка у 500 метрах ад берага. У 150 метрах ад кургана знаходзяцца рэшткі былога хутара Юмарды, да якога вядзе грунтовая дарога. На схіле кургана і яго вяршыне знаходзяцца каменныя крыжы.

2. **Курган** каля в. Мазалава Віцебскага раёна. У 1 км ад усходняй ускраіны вёскі, каля лясной дарогі, што вядзе да в. Сакольнікі, каля кар'ера. Вышыня 2,5 м, дыяметр 8 м.

3. **Гарадзішча** ў в. Сасноўцы Ноўкінскага с/с Віцебскага раёна, каля возера Гараднянскае. Знаходзіцца на заходнім беразе возера Гародня, каля в. Гараднянскі Мох. Узгорак вышынёй 20-25 м. Зараз на ім знаходзяцца могілкі. Пляцоўка авальная, пахаванні ўсе сучасныя (пасляваенныя), хаця па звестках мясцовых жыхароў яны старажытныя і пры капанні магіл, кожны раз знаходзяць рэшткі былых пахаванняў. Ускосна месцазнаходжанне акрамя формы ўзгорка, назвы возера (Гародня), назвы вескі Гараднянскі Мох, указвае і назва вескі Падцаркоўе, якая знаходзілася непасрэдна каля ўзгорка (зараз уключана ў склад вёскі Гараднянскі Мох. Есць звесткі мясцовых жыхароў пра тое, што на версе ўзгорка раней была царква (адпаведна легендзе).

4. **Каменныя крыжы** на могілках «Слабодка» ў п. Лужасна. Могілкі знаходзяцца каля вусця р. Лужаснянка. На некаторых крыжах знаходзяцца петрогліфы, надпісы (Макарыя) і датаванні (1822).

5. **Каменны крыж** на могілках «Кахоўка» ў в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Могілкі знаходзяцца за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, паміж пагоркамі, ва ўрочышчы Кахоўка (былы маёнтак вядомага гісторыка і

краязнаўцы А.П. Сапунова), часткова на курганным могільніку. У 1930-я гады закапаны ў зямлю.

6. **Каменныя крыжы** на могілках у в. Суднікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. На паўднёвай ускраіне вёскі. 7 крыжоў рознага памеру (ёсць вялікія – 0,4 м у шырыні і меньшыя). Некаторыя амаль цалкам у зямлі.

7. **Сядзіба былога маёнтка і рэшткі гаспадарчых забудоў** у в. Лукі Лятчанскага с/с Віцебскага раёна. Сядзіба належала А.А. Астрэйка. Яшчэ да рэвалюцыі тут была прыватная ткацкая школа. Зараз размешчаны дзіцячы санаторый.

8. **Будынак былой царквы Уздзвіжання Крыжа** ў п. Лужасна (мясцовая назва «Мураванка»). Знаходзіцца на самым беразе Дзвіны ў п. Лужасна, каля дарогі, што вядзе ад шашы Віцебск-Гарадок да Лужаснянскага тэхнікума. Пабудавана ў класічным стылі. Будынак вызначаецца прастатой дэкаравай апрацоўкі фасадаў, правільным геаметрычным планаваннем. На сценах вызначаюцца паўкалоны (дарычнага ордэра). Захаваліся франтоны са спухавымі вокнамі. Будынак мае прыбудовы нядаўніх часоў. Да 30-х гадоў XX ст. на плошчы перад царквой праводзіўся кірмаш 17 верасня (у дзень свята Уздзвіжання Крыжа). Блізка ад будынка знаходзяцца магільныя пліты, датуемыя пачаткам – сярэдзінай XIX ст. Пра царкву існуе некалькі паданняў.

9. **Спаса-Узнясенская царква** ў в. Кабішча Пальмінскага с/с Гарадоцкага раёна. У цэнтры вёскі, непадалёк ад берага р. Кабішчанка. Пабудавана з цэглы і каменя. Прасторавая кампазіцыя скпадаецца з крыжовага ў плане асноўнага аб'ёму з навяршаючай шасціграннай абсідай. Сцены прарэзаны вузкімі арачнымі вокнамі, упрыгожаны аркатурай. Архітэктурны дэкор вылучаны спалучэннем каменных сцен і выступаючых упрыгожанняў, выкананых з цэглы. Магчыма былы уніяцкі храм.

10. **Адміністрацыйны будынак Лужаснянскай земляробчай школы** ў п. Лужасна. У паўднёвай частцы пасёлка. Пабудаваны ў 2-й палове XIX ст. з цэглы. Зараз размяшчаецца пошта. Аднапавярховы мураваны Н-падобны ў плане будынак. Фасады вырашаны ў 2 колеры. Вокны шырокія. Стыль мадэрн. Адміністрацыйны будынак сумесна з будынкам Лужаснянскай земляробчай школы [2], складае цэльны архітэктурны ансамбль, але на жаль не ўзяты пад ахову школы.

11. **Маёнтак «Мілае»** ў в. Мазалава Віцебскага раёна. У цэнтры вёскі, каля будынка ПМК № 29. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак. Мае сіметрычную кампазіцыю з ярка вызначанай цэнтральнай часткай – франтонам трохкутнага тыпа. Фасад быў упрыгожаны каванымі балконамі (захаваўся адзін), а бакавы ўваход упрыгожаны кованым навесам. На франтоне магчыма быў гадзіннік. Архітэктура будынка прасгая, з адсутнасцю якіх-небудзь яркіх упрыгожванняў. Па вертыкалі будынак разбіты 3 гарызантальнымі паясамі. Верхняя частка ўпрыгожана аркатурай. Вокны цэнтральнай часткі будынка ўпрыгожаны фігурнымі паясамі. На астатніх упрыгожванні адсутнічаюць. Дах зменены. Быў ці чатырохскатны высокі, ці чатырохскатны ламаны. Канец XVIII – пачатак XIX ст. Класіцызм. Будынак уваходзіў у комплекс маёнтка «Мілае». Належаў вядомаму беларускаму публіцысту, асветніку, удзельніку літаратурнага жыцця на Віцебшчыне 1-й трэці XIX ст. І. Манькоўскаму. Захапляўся і папулярызаваў паэму «Энеіда навыварат», трэба думаць, сам пісаў па-беларуску, у сувязі з чым многія землякі і сучаснікі лічылі яго аўтарам беларускай «Энеіды».

12. **Рэшткі вадзяного млына Шкялі** (непадалек ад в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с). На левым беразе ракі Лужаснянка, каля былога х. Шкялі. У 3 км на поўнач ад в. Трыгубцы і 3 км на паўночны ўсход ад в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Двухпавярховы будынак, першы паверх

зроблены з цэглы, абкладзены дзікім каменем. Другі з каменя, часткова парушаны. Захаваліся некаторыя механізмы.

13. **Будынак паштовай станцыі** каля пас. Завольша Лёзненскага с/с. Пабудавана верагодна ў 1-й палове XIX ст. з цэглы. Стаіць у 100 м ад шашы Лёзна-Смаленск. Галоўны будынак прамавугольны ў плане з чатырохсхільным дахам, мае прыбудову. У архітэктуры будынка эклектычна спалучаны элементы псеўдаготыкі і класіцызму. Паштовая станцыя – помнік дарожнай архітэктуры Беларусі сярэдзіны XIX ст. Падобная па архітэктуры паштовая станцыя ахоўваецца ў в. Кузьміно Гарадоцкага раёна.

14. **Каменныя будынкі** ў в. Ходцы, цэнтр с/с Сенненскага раёна. У цэнтры вёскі. 2 будынкі з апрацаванага каменя, выкладзеныя па вуглах з цэглы. Сцены прарэзаны шырокімі вокнамі. Выкарыстоўваліся як ферма і памяшканне для ўтрымання быкоў. Добра захаваліся.

15. Веска Падваліца Мазалаўскага с/с (не існуе) – былы **маёнтак віцебскага краязнаўцы У.К. Стукаліча**. У 1 км на усход ад в. Калінава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна, паміж асфальтавай дарогай, што вядзе на р.п. Рубу і могілкамі. Магчымае месцазнаходжанне маёнтка У.К. Стукаліча. Падцвержваецца ўскоснымі звесткамі (сведчанні мясцовых жыхароў).

16. Веска Сасноўка Ноўкінскага с/с: а) **сядзібны дом**; б) **будынкі санаторыя**.

а) у цэнтры вёскі, на беразе ручаіны, што цячэ з возера Гародня. Двухпавярховы будынак, прамавугольны ў плане з чатырохсхільным дахам, мае прыбудову. Па бакавых сценах 3 высокія акны з ліштвамі.

б) даўгія, двухпавярховыя карпусы ў стылі мадэрн, з вежамі. Пабудаваны ў пачатку XX ст.

17. **Рэшткі вадзянога млына** ў в. Мазалава Віцебскага раёна. У цэнтры вёскі на беразе р. Лужаснянкі. Разабраны на цэглу. Захаваліся рэшткі падмурка, плаціны, некаторыя механізмы млына. Быў самы вялікі ў Віцебскім уездзе. Верхні драўляны паверх разабраны ў 1983 па загадзе Віцебскага райкама КПСС.

18. **Будынак вадзянога млына** ў в. Прудок Першамайскага с/с Гарадоцкага раёна. У цэнтры вёскі, на беразе р. Усыса каля плаціны. Пабудаваны ў пачатку – сярэдзіне XX ст. з цэглы. Будынак мае тры паверхі. Зараз не выкарыстоўваецца. Помнік вытворчай дзейнасці.

19. **Помнік Сталіну** ў рэчцы Лужаснянка каля п. Лужасна. Знаходзіцца ў р. Лужаснянцы насупраць ветэрынарнага корпуса Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума, бліжэй да левага берага. Помнік уяўле сабой фігуру І.В. Сталіна ў поўны рост, апранутага ў шынель. Выраблен з цвёрдага матэрыялу (верагодна бетон), унутры жалезная арматура. Разбіты на дзве часткі. У некаторых месцах пашкоджаны ломам (8).

20. **БМД-2** (Баявая машына дэсанта-2) каля в. Саўчонкі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. У 4 км ад вёскі, у лесе. Усталявана на пастаменце перад КПП лалігона «Лосвіда» у гонар 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Вывезена з Афганістана.

Верагодныя (дадзеныя не праверaны):

– **каменныя крыжы** на Рызаўскіх могілках на беразе Лужаснянкі каля в. Калінава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна;

– **каменныя крыжы** ў лесе каля в. Каралёва Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна;

– **рэшткі былога вадзянога млына** ў лесе / балоце «Ташнік» непадалёк ад в. Суднікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна;

– **скапленне валуноў** каля в. Берашова Сенненскага раена, магчымае месца былога капішча.

**Аб'екты,**
**якія могут быць зарэгістраваны як помнікі прыроды**

## Батанічныя аб'екты

### Групы дрэў і каштоўныя насаджэнні:

1. **Каштоўнае насаджэнне хваёвых дрэў** на беразе Дзвіны каля в. Калінава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна:

1.1. Каштоўнае насаджэнне хвояў і елак у 2 км на поўнач ад вёскі ўздоўж Дзвіны. Месца знаходзіцца на правым беразе ракі (насупраць в. Падбярэззе), у 400 м ад а/л «Чайка» ВА «Маналіт». Ад стадыёна а/л «Чайка» уздоўж берага, растуць каля 20 хвояў і 20 елак. Даўжыня акружнасці (абхват) ад 2,50 см, да 2,05 см. Пачынаюцца ў 350 метрах ад стадыёна і растуць на працягу 400 метраў да бярозавага гая, што каля а/л «Арлёнак». Дрэвы вырастаюць і ля самага края берага і ў 50 м ад яго. (Бераг абрывісты, вышыня 10–15 метраў, да вады 20-30 метраў).

Хвоі:

1. l=2,50. ⇒ d= 0,80 см
2. l=2,30. ⇒ d= 0,73 см – ля самай сцежкі
3. l=2,30. ⇒ d= 0,73 см
4. l=2,30. ⇒ d= 0,73 см – на вышыні 3,5 м раздвойваецца.
5. l=2,25. ⇒ d= 0,71 см
6. l=2,22. ⇒ d= 0,70 см
7. l=2,20. ⇒ d= 0,70 см
8. l=2,10. ⇒ d= 0,80 см – ля лесвіцы, што вядзе да вады.
9. l=2,10. ⇒ d= 0,80 см
10. l=2,10. ⇒ d= 0,80 см

Елкі – ад l=2,25. ⇒ d= 0,71 см і меней.

1.2. За ручаінай а/л «Арлёнак» (Трэст сталовых) таксама растуць падобныя дрэвы. Каля 40-50. Большасць елкі. Дыяметр ≈ 60–75 см.

2. **Дубы** каля в. Сосноўка Ноўкінскага с/с Віцебскага раёна. 5 дрэў з дыяметрам 0,6=0,85 м растуць у вёсцы і на полі, непадалёк ад населенага пункта.

3. **Хвойнік** каля в. Цяцёркі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Каштоўнае насаджэнне хвоі звычайнай. Дыяметр дрэў ад 0,7 м да 1 метра. Дрэвы растуць на беразе Дзвіны, на мясцовых могілках.

4. 4 вялікія **серабрыстыя таполі** на беразе Дзвіны паміж купальняй а/л «Бярозка» і стадыёнам а/л «Чайка» непадалёк ад в. Калінава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

1-я. l = 4,15. ⇒ d = 1,32 см, 2-я. l = 4,00. ⇒ d = 1,27 см, 3-я. l = 3,45. ⇒ d = 1,09 см, 4-я. l = 2,63. ⇒ d = 0,83 см.

5. Вялікія **серабрыстыя таполі** на беразе возера Лосвіда каля в. Малое Лосвіда Пруднікаўскага с/с Гарадоцкага раёна. 4 дрэвы з дыяметрам больш за 1 метр.

### Асобныя дрэвы і групы дрэў:

1. **Хвоя** каля в. Сушчова Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Дыяметр хвоі 142 см. Вышыня 28 метраў. Узрост прыкладна 200-250 гадоў. Вымярэнні праводзіліся спецыялістамі Віцебскага лясгаса ў жніўні 2000 года.

2. **Хвоя** каля в. Бібіраўка Віцебскага раёна. Знаходзіцца на паўночнай ускраіне вёскі, у 30 метрах ад дарогі, што вядзе ў в. Уланавічы. Даўжыня акружнасці хвоі 491 см. Дыяметр – 156 см, радыус – 78 см. На вышыні

2,5 метра патройваецца. На вышыні прыкладна 5-6 метраў 2 ствалы яшчэ патройваюцца. Адна з самых вялікіх і незвычайных хвой ў рэспубліцы.

3. **Вялікая хвоя** расце на тэрыторыі аздараўленчага лагера «Зорька» (Будтрэст № 9). Даўжыня акружнасці – 2,40 метра. На вышыні прыкладна 4 метры яна патройваецца. Дыяметр – 77 см.

4. **Дуб-волат** у в. Сасноўка Ноўкінскага с/с Віцебскага раёна. Радыус 0,85 м.

5. **Хвоя** каля в. Малае Лосвіда Пруднікаўскага с/с Гарадоцкага раёна. У 1,5 км на захад ад турбазы «Лосвіда». Расце каля воз. Лосвіда, непадалёк ад урэза вады. Даўжыня акружнасці – 275 см, дыяметр хвоі – 0,85 м.

6. **Дуб, які зросся з ясенем** у п. Лужасна Віцебскага раёна. Узрост – каля 30 год. Растуць каля стадыёна тэхнікума і дарогі, што вядзе да гімназіі. Мясцовая назва «Браты». Унікальны аб'ект прыроды.

7. **Хвоя, якая зраслася з бярозай** каля в. Калінава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Расце на тэрыторыі а/л «Бярозка» (фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік»). Узрост – прыкладна 30 год.

8. **Дубы** каля в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. У 2 км ад вёскі 2 дуба ўзростам па 150-200 гадоў. Растуць уздоўж лясной дарогі ад в. Сакольнікі да в. Мазалава, нездалек ад берега р. Лужаснянкі. Прыблізны дыяметр 0,9 м.

9. **Вяз** у п. Лужасна Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Знаходзіцца на самым беразе ракі Лужаснянка, непадалёк ад вады, каля клінічнага корпуса Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума. Даўжыня акружнасці – 330 см, дыяметр – 105 см.

10. **Клён вострalісны** ў в. Дарагакупава (Прыдзвінне) Лятчанскага с/с. У цэнтры вёскі. Даўжыня акружнасці – 290 см, дыяметр – 92 см. З аднаго боку ствол пашкоджаны высячанай выявай далоні чалавека памерамі 0,7 м на 2 м.

11. **Вяз** каля в. Мястэчка Езярышчанскага п/с Гарадоцкага раёна. За 3 км на поўнач ад вёскі, на мысе возера Езярышча. Расце каля дарогі, што вядзе ад могілак да курганоў на беразе возера. Даўжыня акружнасці – 525 см, дыяметр – 167 см, радыус – 83 см.

**Месцы вырастання рэдкіх і занесеных у Чырвоную кнігу раслін:**

1. **Месца вырастання вадзянога імха Цынклідотуса Дунайскага** (*Cinclidotus Danubicus*). Каля п. Руба Віцебскага раёна на даламітавых парогах на рацэ Дзвіна. Адзначанае месца з'яўляецца адзіным месцам вырастання Цынклідотуса Дунайскага (*Cinclidotus Danubicus*) у краіне. Месца адзначана ў Чырвонай кнізе, але не ахоўваецца.

2. **Месца вырастання рагулькаў высокіх** (*Delphinium elatum*) каля в. Дутчына Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. У 800=1500 м на ўсход і паўночны ўсход ад вёскі, на берагах ракі Лужаснянка. Выяўлена некалькі папуляцый з колькасцю раслін ад 2 да 50 экземпляраў.

3. **Месцы вырастання шпажніка чарапіцавага** (*Gladiolus imbricatus*) каля в. Дутчына і в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна.

3.1. У 500 м на ўсход ад в. Дутчына, на пойменным лузе правага берага ракі Лужаснянка.

3.2. У 400 м на поўдзень ад в. Сакольнікі, на пойменным лузе правага берага ракі Лужаснянка. Па баках дарогі, што вядзе да в. Каралёва.

4. **Месцы вырастання пярэсны еўрапейскай** (*Trollius europaeus*) каля в. Каралева Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. На поўдзень і паўднёвы ўсход ад вёскі ў меліярацыйных каналах.

5. **Месцы вырастання плауна баранца** (*Huperzia selago*) каля чыгуначнай станцыі Прудок Гарадоцкага раёна. У лясным масіве на левым беразе р. Усыса. Уздоўж дарогі, што вядзе ад вёскі да возера Кашо.

**Валуны:**

1. **Валун** каля в. Доўжа Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Мясцовая назва «Камень Любві», закаханых. 400 метраў на паўднёвы ўсход ад ускраіны вескі, непадалёк ад падстанцыі і лініі элекграперадач, на правым беразе ракі Храпаўлянкі ў 10 метрах ад урэза вады на адрэзку паміж азёрамі Сярэднім і Малым. Даўжыня 250 см; шырыня 160 см, вышыня 320 см. З камнем звязана некалькі паданняў. Легенды ўскосна сведчаць пра выкарыстанне камня ў якасці месца ахвярапрынашэнняў.

2. **Валун** каля чыгуначнай станцыі Залучча Гарадоцкага раёна. Знаходзіцца ў 100 метрах ад перакрыжавання шашы Віцебск-Гарадок і дарогі на в. Марыямпаль. Большая частка камня знаходзіцца ў зямлі. Даўжыня каля 300 см; шырыня каля 200 см. Пакрыт імхом і лішайнікамі.

3. **Валуны** каля п. Лужасна.

3.1. **Валун** на паўднёва-заходняй ускраіне пасёлка Лужасна, каля дарогі, што вядзе са студэнцкага гарадка да гімназіі і далей, на канечны прыпынак аўтобуса 14. Вышыня 93 см, даўжыня 196 см, шырыня 105 см, акружнасць 438 см. Парода – граніт.

3.2. **Валун** на паўднёва-заходняй ускраіне пасёлка Лужасна, каля дарогі, што вядзе са студэнцкага гарадка да гімназіі і далей, на канечны прыпынак аўтобуса 14. Знаходзіцца паблізу ад дома 7. Вышыня 133 см, даўжыня 216 см, шырыня 166 см, акружнасць 496 см. Парода – вапняк. Паточаны кавернамі, некалькі дзірак. Пакрыт імхом і лішайнікамі.

3.3. **Валун** на паўднёва-заходняй ускраіне пасёлка Лужасна, каля дарогі, што вядзе са студэнцкага гарадка да гімназіі і далей, на канечны прыпынак аўтобуса 14. Знаходзіцца паблізу ад дома 8. Вышыня 124 см, даўжыня 230 см, шырыня 196 см, акружнасць 630 см. Парода – граніт. Раслінны пакроў адсутнічае. Быў выцягнуты на паверхню з катлавана пры будаўніцтве дома.

3.4. **Валун** пасярэдзіне ракі Дзвіна. Форма кроплевідная, плоскі. Даўжыня 250 см, шырыня 180 см, вышыня 120 см. Бачны па малой вадзе.

4. **Валун** каля в. Мазалава Віцебскага раёна. Знаходзіцца на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, на левым беразе ракі Лужаснянка. Вышыня 130 см, даўжыня 300 см, шырыня 220 см.

5. **Валун** каля в. Герасімава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Знаходзіцца непадалеку ад лодачнай станцыі. Вымярэнні не праводзіліся.

6. **Валун** каля в. Прыдзвінне (Дарагакупава) Лятчанскага с/с Віцебскага раёна. Знаходзіцца ў 1,5 км на захад ад вёскі, у 300 м ад берага Дзвіны. Вышыня 150 см, даўжыня 300 см, шырыня 255 см.

Верагодныя (звесткі не праверены):
- **валун** каля в. Лукі Віцебскага раёна ў балоце;
- **валун** каля в. Храпавічы Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна.

**Іншыя аб'екты:**

**«Напалеонаўская дарога»** на возеры Лосвіда. Унікальны азёрны аб'ект – водмель, з аднаго берага возера да другога. Знаходзіцца каля в. Марыямпаль Пруднікаўскага с/с Гарадоцкага раёна. Месца вырастання рэдкіх раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі (гідрыла мутоўчатая, частуха Валенбергаі, палушнік вазерны і іншых) і пражывання жывёл і птушак. Яшчэ ў савецкі час на берагах возера планавалася стварэнне батанічнага заказніка.

Існуе некалькі легенд. Па адной дарога была насыпана д'яблам для таго, каб выратаваць войскі Напалеона, якія былі абкружаны ў гэтым месцы рускімі войскамі. Па другой зроблена бацькамі пакахаўшых адзін аднаго дзяўчыны і хлопца, якія жылі на розных баках возера для сустрэч. Па трэцяй дарога была насыпана памешчыкам для забаў і жартаў над гасцямі. Яшчэ ў 1970-я гады выкарыстоўвалася як дарога, мела гаспадарчае значэнне.

**Чыгуначная станцыя Лужасна** Віцебскага раёна. Месца, дзе зарэгістравана мінімальная тэмпература на Беларусі (-44°С у 1940 годзе). Цікава для правядзення экскурсій, асабліва сярод школьнікаў.

**Анамальная зона каля в. Лукі** (В. Лятчанскі с/с). Існуе шмат паданняў пра месца, дзе губляюцца ў часе. Людзям падаецца, што яны былі тут гадзіну ці каля таго, на самой жа справе яны адсутнічалі да некалькіх гадзін, ці нават дзён.

З атрыманага досведу па пошуку помнікаў прыроды вынікаюць некалькі практычных прапаноў і заўваг. Першае. Акрамя вышэй пералічаных аб'ектаў, якія ўжо знойдзены, засталося яшчэ шмат нявыкрытых. Яны патрабуюць як мага хутчэйшых вышукаў і рэгістрацыі.

Другое. У наваколлях Віцебска захавалася шмат яшчэ нявыяўленых месцаў вырастання раслін і пражывання жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу РБ. Але не ўсе яны могут быць зарэгістраваны як помнікі прыроды на наш час. У выніку інтэнсіўнай дзейнасці чалавека (выпас жывёлы, высечка лясоў, выкід прамысловага смецця і іншыя), яны знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Арганізацыя батанічных, ці арніталагічных заказнікаў у такіх месцах часта эканамічна не апраўдана з прычыны іх нязначнай велічыні. Выйсце бачыцца ў арганізацыі ў такіх месцах мініказаказнікаў мясцовага падначалення пры разуменні і экалагічнай свядомасці насельніцтва.

Трэцяе. Ужо зараз расце шмат вялікіх, рэдкіх, цікавых дрэў, каштоўных насаджэнняў, якія праз нейкі час змогуць падыйсці пад статус помнікаў прыроды. Мае сэнс стварыць «*Малую Чырвоную кнігу* раёна». Туды будуць заносіцца звесткі пра перспектыўныя прыродаахоўныя помнікі з мэтай іх рэгістрацыі, кантролю за станам, маніторынгу, выхавання пазітыўна-экалагічнанага светапогляду, папулярызацыі ведаў пра свой край.

У якасці прыклада можна прывесці звесткі пра такія дрэвы ў наваколлях п. Лужасна.

Дрэвы, вартыя аховы ў п. Лужасна Віцебскага раёна:

1. Дуб каля клінічнага корпуса. Даўжыня акружнасці – 234 см. Радыус – 74,5 см.
2. Дуб каля ўвахода ў Лужаснянскі дэндрапарк. Даўжыня акружнасці – 237 см. Радыус – 75,4 см.
3. Бяроза барадаўчатая, каля ўвахода ў Лужаснянскі дэндрапарк. Даўжыня акружнасці – 230 см. Радыус – 73,2 см.
4. Лістоўніца каля галоўнага корпуса Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума. Даўжыня акружнасці – 205 см. Радыус – 65,2 см.
5. Ліпы (5 дрэў) каля будынка былой Земляробчай школы. Састаўлялі элемент парку «альтанка» пры парку сельскагаспадарчай школы.

Удзел у краязнаўчай працы па вывучэнні помнікаў гісторыі, культуры і прыроды аказаўся надзвычай карысным, як з боку вывучэння роднага краю, так і выхавання вучняў. У выніку дзейнасці былі выяўлены і атрыманы звесткі пра 20 аб'ектаў, якія могут быць зарэгістраваны як помнікі гісторыі і культуры, пра 37 магчымых помнікаў прыроды. Важнасць праведзенай дзейнасці вызначалася таксама не толькі навуковымі, але і культурна-пазнавальнымі і аздараўленчымі мэтамі. Краязнаўчая праца дае магчымасць актыўна, на практыцы вывучаць гісторыю, геаграфію, геалогію, флору і фауну сваёй мясцовасці, удзельнічаць у яе ахове.

Спадзяемся, што новыя звесткі будуць старанна вывучаны адпаведнымі арганізацыямі і паспрыяюць захаванню гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны, выхаванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскіх якасцяў жыхароў краю.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Памятники природы Белоруссии / В.М. Вельский и др.*** 2-е изд., перераб. и доп. Мн., 1986. – 175 с.
2. ***Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць.*** БелСЭ, 1985. – 496 с.
3. ***Газин Д.Р.*** Сапуновские сокровища. Витебск, 1998. – 18 с.
4. ***Газин Д.Р.*** Мазаловская Швейцария. Витебск, 1992. – 16 с.
5. ***Паўлаў М.*** Астровенскі касцёл. Віцебск, 1994. – 8 с.
6. ***Подлипский А.*** Ботаник Владимир Адамов. Витебск: Витебская областная типография, 2000. – 32 с.
7. ***Асветнікі зямлі Беларусі***: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001. – 496 с.
8. ***Пивовар Н.В.*** Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска. Витебск, 2002. – 116 с.
9. ***Півавар М.*** Краязнаўчыя цікавасці і турыстычныя рэсурсы месцаў, звязаных з дзейнасцю А.П. Сапунова // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю. Матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова. Мн., 2002. – 232 с.
10. ***Півавар М.В.*** Методыка пошукаў помнікаў прыроды ў краязнаўчай працы. Віцебск, 1999. – 32 с.
11. ***Пивовар Н.*** «Самая большая сосна в Беларуси» // Жыццё Прыдзвіння, 22.05.2001.
12. ***Пивовар Н.*** «Дикий гладиолус на берегу Лужеснянки» // Народнае слова, 28.01.1999.
13. ***Аглядна-тапанімічная карта з дадзенымі аб асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыях і аб'ектах***. Мш. 1 : 500000 см. Мн., 1996.
14. ***Топографическая карта «Окрестности г. Витебска».*** Мш.,1 : 200000 см. Мн., 1996.



## *SUMMARY*

*The article is devoted to the problem of finding, registration and defending of natural, historical and cultural monuments. The article contains the information about new, unknown before national monuments in Vitebsk's vicinity.*



*Поступила в редакцию 3.12.2002*